Маскевіч, Г. І. Адлюстраванне сацыяльнага статуса сялянства Беларусі ў вясельнай і пахавальнай абраднасці XIX ст. / Г. І. Маскевіч // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 2 / рэдкал. У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.] – Мн: БДУ, 2007. – С. 147–150

***Г. І. МАСКЕВІЧ***

# АДЛЮСТРАВАННЕ САЦЫЯЛЬНАГА СТАТУСА СЯЛЯНСТВА БЕЛАРУСІ Ў ВЯСЕЛЬНАЙ І ПАХАВАЛЬНАЙ АБРАДНАСЦІ XIX ст.

Сацыяльная стратыфікацыя адлюстроўвае існаванне сацыяльнай няроўнасці ў грамадстве, падзел на бедных і багатых, прывілеяваных і непрывілеяваных. Падзел гэты ажыццяўляецца на падставе пэўных прыкмет, валоданне якімі і дазваляе выдзяляць групы людзей у асобную сацыяльную страту. Можна казаць аб існаванні саслоўна-класавай, прафесійнай, маёмаснай, культурнай, этнічнай, палавой стратыфікацыі і г. д. Акрамя таго, выдзяляецца і так званая неафіцыйная стратыфікацыя, у падмурку якой — індывідуальны аўтарытэт.



Для асобы існуюць магчымасці сацыяльнага ранжыравання нават пры ўмове нязменнай прыналежнасці да сваёй звычайнай сацыяльнай страты, групы. У сялянскім асяродку былі розныя пласты неафіцыйнага прызнання, лідэрства, павагі. Кожны асобны селянін, з'яўляючыся прадстаўніком ніжэйшага саслоўя ў агульнаграмадскім сэнсе, у пэўным асяродку мог карыстацца высокім аўтарытэтам, які ўзвышаў яго асабісты сацыяльны статус. Шмат у чым гэты статус вызначалі грамадскія адносіны, асабістая думка. Такая дыферэнцыяцыя найбольш яскрава прасочваецца па змесце народных твораў, звычаяў абрадаў, дадзеных этнаграфічных крыніц. У апісанні звычаяў і абрадаў звычайна не надаецца ўвагі адрозненням і асаблівасцям іх выканання ў розных пластоў сялянства. Яны падаюцца як агульнасялянскія. Падмурак і змест у іх аднолькавыя, аднак існуюць і пэўныя адметныя рысы, якія сведчаць пра маючую месца сацыяльную дыферэнцыяцыю ў беларускай вёсцы.

На значэнне грамадскай думкі ў жыцці кожнага селяніна і ўплыў на яе абрадавай дзейнасці ўказвае М. Федароўскі: «Веданне і правільнае правядзенне спецыфічных абрадавых дзеянняў і рытуалаў уваходзіла ў кодэкс выхавання дзяцей і моладзі. Добрае веданне і дэталёвае выкананне традыцыйных звычаяў і абрадаў адыгрывала немалаважную ролю ў фарміраванні становучай ці адмоўнай грамадскай думкі аб той ці іншай сям'і, што мела важнае значэнне для апошняй»[1].

Сацыяльны статус селяніна даволі яскрава адлюстроўваўся ў сямейных абрадах і звычаях. Асабліва гэта тычыцца вяселля і пахавання. М. В. Доўнар-Запольскі пісаў, што «на заключение брака оказывает немалое влияние достаток родителей… В особенности это сильно отражается на бедных семействах». Там жа зазначаецца: «...бедные и большие семьи стараются отдавать своих сыновей в дом богатых мужиков. Это называется «ісці ў прыймы». Гэты прыклад яскрава сведчыць аб усведамленні самімі сялянамі сваёй сацыяльнай няроўнасці, размежавання ў сваім асяродку, аб існаванні на вёсцы маёмаснай дыферэнцыяцыі, якая ўплывала на розныя сферы жыцця. У «прыймы» звычайна ішлі «отставные солдаты, бобыли»[2]. Таму можна зрабіць вывад аб нізкім сацыяльным становішчы прадстаўнікоў гэтых груп. Грамадскія адносіны да іх былі адпаведныя.

Сведчаннем павагі, аўтарытэту было запрашэнне ў сваты. Звычайна сватам быў хросны бацька «или кто-либо из соседей побогаче и поважнее»[3]. У такіх звычаях прасочваецца прамая залежнасць сацыяльнай павагі ад маёмаснага стану. Тут жа адлюстравана і асаблівае стаўленне да хросных бацькоў. Хросная маці павінна была ісці ў даведкі ў дом жаніха [4]. Гэта сведчыла аб яе аўтарытэце для сям'і нявесты, бо ёй даручалі такую адказную спра-



ву, як «агляд» жаніха. Калі ў час заручын сем'і маладых абменьваліся падарункамі, то абавязкова сват павінен быў прывесці жытні пірог для хросных бацькоў [5].

У традыцыйным вясельным рытуале беларусаў значнае месца адводзілася такому атрыбуту, як каравай. Усе рэчы, людзі, прадметы, што мелі дачыненне да прыгатавання каравая, набывалі асаблівае значэнне. Па гэтай прычыне быць «каравайнымі запрашалі ... хросных маці, тых жанчын, якія мелі добрую славу сярод аднавяскоўцаў»[6], што сведчыць пра ўплыў асабістага аўтарытэту на адносіны грамады да асобы, пра ўплыў грамадскай думкі на фарміраванне сацыяльнага статуса асобы — больш адказныя абавязкі давяралі выконваць найбольш паважаным, аўтарытэтным сярод вяскоўцаў людзям. У працэсе прыгатавання каравая

адлюстроўваўся і маёмасны стан сям'і. Бяднейшыя сяляне выпякалі караваі з жытняй мукі, а багацейшыя — з пшанічнай. Жыта, прызначанае для прыгатавання каравая, «заможнейшыя сяляне адвявалі, бяднейшыя — малолі зерне з «пушком» і абрадавае цеста выпякалі з мукі, напалову змешанай з мякінай»[7]; колькасць караваяў таксама залежала ад заможнасці.

У вясельнай абраднасці адлюстраваны і сацыяльныя адносіны да дзяўчат. Становішча той дзяўчыны лічылася больш высокім, да якой ездзіла больш сватоў [8]. Наадварот, дзяўчына была не вельмі паважанай, калі да яе не жадалі сватацца. Трэба зазначыць акалічнасці, якія ўплывалі на колькасць сватоў да дзяўчыны, а тым самым і на яе стан. Вось як аб гэтым пісаў М. В. Доўнар-Запольскі: «При выборе невесты опять-таки руководствуются, во-первых, тем соображением, чтобы девушка была хорошей работницей, не имела за собой худой славы, отличалась здоровьем, хорошим телосложением и при том была из такой семьи, которая вполне соответствовала семье сына по достатку»[9]. Калі ў назначаны тэрмін дзяўчына не выходзіла замуж, то бацькі павінны былі «выплаціць штраф». У гэтым звычаі праяўлялася маёмасная дыферэнцыяцыя, бо памер выплат залежаў ад прыбытку гаспадара: «...з сярэдняга дома — 25 рублёў, з багатага — 50 рублёў, бедных жа — караць, як палічыць начальства». Пасля выплаты штрафу «начальнік, запрасіўшы выбарных асоб і лепшых прадстаўнікоў старэйшага пакалення, падшукваў гэтым дзеўкам жаніхоў на свой густ»[10]. Бачна, што ў сялянскім асяроддзі вельмі вялікае значэнне мела добрая рэпутацыя, ад якой шмат што залежала ў далейшым жыцці. Акрамя таго, у звычаі выплаты штрафу прасочваецца і стан кіруючых асоб, якія мелі значны ўплыў на розныя бакі жыцця вяскоўцаў, а значыць, і пэўны аўтарытэт і павагу.

Адрозненні ў сацыяльным статусе паміж сялянамі адлюстраваны і ў пахавальна-памінальнай абраднасці. Не ўсе мелі магчымасць аднолькава пра-



водзіць сваіх блізкіх у «апошні шлях». У больш заможных сем'ях у хату запрашалі святара: «...если семья достаточная, приглашают священника»[11]. Ён спавядаў і прычашчаў паміраючага і чытаў над ім «отходную молитву»[12]. У адным з аповедаў селянін просіць пахаваць памерлую жонку адразу, не чакаючы трох дзён, бо ён «очень бедный, и нет денег на водку, а «на сухое» никто не захочет с покойницей ночь сидеть»[13]. У І. У. Рубаноўскага прыводзяцца звесткі, што звычайна зверху нябожчыка пакрывалі белым палатном, наміткаю ці іншымі белымі тканінамі, у больш заможных сем'ях — прынесеным з царквы парчовым пакрывалам [14]. Такія дадзеныя адлюстроўваюць дыферэнцыяцыю паміж сялянамі, заснаваную на іх маёмасных магчымасцях.

Сацыяльны статус селяніна залежаў ад розных акалічнасцей. На яго аказвалі ўплыў маёмасныя магчымасці гаспадара, высокія афіцыйныя паўнамоцтвы, кіруючае становішча, аднак у вясковым асяродку часта найбольш значную вагу мелі грамадская думка і асабісты аўтарытэт, які фарміраваўся пад яе ўплывам. У вясельнай і пахавальнай абраднасці пэўным чынам адлюстравана сацыяльная дыферэнцыяцыя, якая выяўлялася ў розных сферах жыццядзейнасці, праз розныя аспекты — ад афіцыйнага да звычаёвага.

---

1 *Федароўскі М.* Люд беларускі. Вяселле. Мн., 1991. С. 112.

2 *Довнар-Запольский М. В.* Белорусская свадьба и свадебные песни. Киев, 1888. С. 5.

3 Тамсама. С. 8.

4 Беларусы. Т. 5: Сям'я / В. К. Бандарчык, Г. М. Курыловіч, Т. І. Кухаронак і інш. Мн., 2001. С. 224.

5 Тамсама. С. 237.

6 Тамсама. С. 247.

7 Тамсама. С. 251.

8 Тамсама. С. 232.

9 *Довнар-Запольский М. В.* Белорусская свадьба и свадебные песни. С. 7.

10 Беларусы. Т. 5: Сям'я. С. 222.

11 *Киркор А. К.* Народная жизнь // Живая старина. Мн., 1993. С. 281.

12 *Рубановский И. В.* Этнографический очерк Могилевской губернии // Опыт описания Могилевской губернии. Могилев-на-Днепре, 1882. Кн. 1. С. 355.

13 Нацыянальны гістарычны архіў Рэспублікі Беларусь. Ф. 1416. Воп. 6. Спр. 405.

14 *Рубановский И. В.* Этнографический очерк Могилевской губернии ... Кн. 1. С. 650.